

# ДА 60-ГОДДЗЯ
# ТАЦЦЯНЫ МІКАЛАЕЎНЫ ЯЦУК

**Дарагая Таццяна Мікалаеўна!**

Вось і яшчэ адна круглая дата на календары. Але не варта сумаваць, – лёс Вам выпаў шчаслівы: творчая грамадская дзейнасць, сумленная праца, любоў і павага людскія; заўсёды побач Вашы родныя, калегі і аднадумцы. На шляху мастацтва Вы зарэкамендавалі сябе сапраўдным патрыётам, прызнаным майстрам беларускага прыгожага пісьменства, а ў калектыве – надзейным сябрам, добрым, спагадлівым чалавекам. Напісаныя Вамі радкі нясуць гаючую сілу роднага слова, святло народнай мудрасці, гарманічнае адзінства традыцый і сучаснасці. Дарагая Таццяна Мікалаеўна! У дзень Вашага 60-годдзя прыміце ад нас шчырыя пажаданні здароўя і дабрабыту, натхнення і поспехаў у працы і творчасці. Няхай будуць здаровымі ўсе Вашы блізкія, а кожны новы дзень прыносіць толькі радасць і задавальненне. Дзякуй Вам за тое, што Вы ёсць. **З ЮБІЛЕЕМ!**

Калектыў
Гродзенскага абласнога аддзялення
Саюза пісьменнікаў Беларусі

***19 сакавіка 2023 года***. *Гродна-Баранавічы*

